Падтрымай "Вясну" на PATREON

У Гродна адбыліся суды яшчэ над трыма актывістамі

30.03.2017 **Тэгі**: суды



Вадзім Саранчукоў на судзе 30 сакавіка 2-17 года.

У судзе Ленінскага раёна Гродна 30 сакавіка разглядаліся адміністрацыйныя справы ўдзельнікаў акцый пратэсту Вадзіма Саранчукова, Антона Вайцехава і Мікалая Саляніка.

Суды над актывістамі распачаліся а 10-ай гадзіны. Справу Вадзіма Саранчукова разглядала суддзя **Наталля Козел**, справу Вайцехава – суддзя **Р. Гурын**, справу Саляніка – суддзя **Дзмітрый Бубенчык**.

Сведкамі па справе Вадзіма Саранчукова выступалі міліцыянты **Максім Варанкоў** і **Яўген Палівода**. Абапіраючыся на іх паказанні, суддзя вынесла рашэнне пакараць Саранчукова штрафам у 15 базавых велічынь за парушэнне арт. 23.34 КаАП РБ.

Антона Вайцехава прысудзілі да 10 сутак адміністрацыйнага арышту.

Мікалай Салянік прыйшоў на судовае паседжанне толькі пасля перарыву, бо ўвогуле не ведаў, што у гэты дзень адбудзецца суд. У выніку суддзя Д. Бубенчык пакараў Саляніка арыштам на 7 сутак.

Тым часам у Гарадзенскім абласным судзе суддзя **А. Козел** не задаволіў касацыйныя скаргі **Ірыны Давідовіч** і **Віталя Гуляка** на штрафы за акцыю ў Гродна 19 лютага.

Твитнуть







ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

Палітзняволеную Вікторыю Кульшу ў зарэчанскай калоніі збіваў і душыў наглядчык

"У мяне ў першы ж дзень на ЦІПе здарыўся прыступ асфіксіі", — былая арыштантка Акрэсціна

"Мы прыдумлялі розныя махінацыі, каб папросту выжыць", — экс-зняволены пра жыццё і працу ў шклоўскай калоніі

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў



ГАЛОЎНАЕ

21 траўня — Дзень палітвязняў у Беларусі. Далучайся да акцыі салідарнасці!



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Патрабуем правясці расследаванне па факце смерці Мікалая Клімовіча і адсутнасці належнай медычнай дапамогі ў калоніях

"Хапун" у Гродна і новыя "тэрарысты": хроніка пераследу 12-13 траўня

Сродкі здзяйснення злачынства – штаны і майка. Мужчыну асудзілі па “народным” артыкуле

Заснавальніка Symbal.by Паўла Белавуса асудзілі да 13 гадоў калоніі

З'явіўся "даведнік рэпрэсій" на англійскай мове. Ён дапаможа міжнароднай супольнасці лепей разумець становішча ў Беларусі

Мастака Генадзя Драздова асудзілі да трох гадоў калоніі

Падазраюць у здрадзе дзяржаве і здзяйсненні акту тэрарызму: хроніка пераследу 10-11 траўня (дапоўнена)

Адвакатку Анастасію Лазарэнку асудзілі да 6 гадоў калоніі

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Красавік 2023



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh













E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

